# Эканоміка і экалогія. Як сумясціць?

**Маштабны праект “Садзейшчанне пераходу Рэспублікі Беларусь да “зялёнай” эканомікі”, які фінансаваўся Еўрапейсюм Саюзам і рэалізаваўся Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, накіраваны на фарміраванне эканамічнага росту, заснаванага на “зялёных” прынцыпах. Ён ажыццяўляўся ў некалькіх галінах эканомікі: абыходжанне з адходамі, захаванне біяразнастайнасці, “зялёны” транспарт, арганічная сельская гаспадарка, экатурызм, фітавытворчасць, абыходжанне з воднымі рэсурсамі экаінавацыі.**

**Здолеем толькі разам**

Праект не толькі дазволіў пашырыць веды беларускага грамадства аб прынцыпах і ідэях “зялёнай" эканомікі, але і паспрыяў іх развіццю ў рэгіёнах праз рэалізацыю пілотных ініцыятыў. Паспяховасць праекту дазволіла стварыць эфектыўныя механізмы партнёрства і сумеснай дзейнасці грамадскіх арганізацый, мясцовых адміністрацый і бізнес-арганізацый для рэалізацыі эканамічна і экалагічна абгрунтаваных ініцыятыў.

У рамках праекту былі рэалізаваны 23 пілотныя праекты і ініцыятывы ў розных рэгіёнах Беларусі, з іх 16 — з прыцягненнем грамадскіх арганізацый у партнёрстве з дзяржаўнымі органамі кіравання, бізнес-супольнасцямі, фермерамі. Паспяховая рэалізацыя пілотных праектаў і ініцыятыў забяспечыла дасягненне эканамічных, сацыяльных і экалагічных эфектаў. Дзякуючы гэтаму, былі створаны 50 новых “зялёных” працоўных месцаў і 270 чалавек атрымалі магчымасці для дадатковай занятасці.

Яшчэ адным важным напрамкам стала інфармацыйная падтрымка ідэй “зялёнай” эканомікі. У рамках праекту быў дапрацаваны партал “Зялёная мапа”, дзе сабрана інфармацыя пра важный экалагічныя аб’екты Беларусі, а таксамі распрацавана гульня для мабільных тэлефонаў “Зялёная эканоміка”.

**Зялёныя “пілоты”**

Аляксей Чыстадарскі, кіраўнік аддзела камунікацый і сувязей з грамадскасцю ПРААН, распавёў, што ў рамках аднаго з праектаў у Барысаве была арганізавана першая ў Беларусі вытворчасць высакаякаснай офіснай паперы з другасных рэсурсаў. На базе заказніка “Налібоцкі” створаны гадавальнік для штучнага вырошчвання птушак цецеруковых парод. У Брэсце паспяхова дзейнічае комплекс па перапрацоўцы драўняных адходаў у біяпаліва. У Жыткавічах наладжана атрыманне высокаэфектыўных арганічных угнаенняў шляхам глыбокай перапрацоўкі сапрапелю.

Экспертамі праекту былі распрацаваны экатурыстычная і маркетынгавая стратэгіі для заказнікаў “Прыбужскае Палессе” і “Свіцязянскі”, створаны ўмовы для развіцця экатурызму і інфармацыйна-экалагічных цэнтраў заказнікаў. Для палацава-паркавага комплексу Радзівілаў распрацавана стратэгія развіцця “зялёнага” транспарту і пастаўлены першы у Беларусі турыстычны электрааўтобус для садова-паркавай зоны.

Аляксей Чыстадарскі адзначыў, што пілотныя ініцыятывы праекту рэалізаваны і ў некалькіх сектарах эканомікі (фітавытворчасць, абыходжанне з воднымі рэсурсамі і адходамі, экатурызм, падтрыманне біяразнастайнасці, экаінавацыі, арганічнае земляробства):

— Фітавытворчасць была наладжана ў Мядзельскім раёне. Там быў адкрыты вытворча-навучальны цэнтр “Фітатэрапія 21 стагоддзя”, распрацавана ўстойлівая сістэма збору і першаснай перапрацоўкі дзікарослай лекавай сыравіны. На тэрыторыі раёна створаны ўмовы і інфраструктура для культывавання лекавых раслін мясцовымі жыхарамі на землях асабістых падсобных гаспадарак з мэтай атрымання дадатковага даходу. У Камянецкім раёне тэрыторыя чатырох вёсак ператворана ў фітатурыстычную дэстынацыю і месца па вытворчасці

фітагарбаты, распрацаваны маршрут “Водар Белавежжа".

Разумнае абыходжанне з воднымі рэсурсамі — адзін з найважнейшых напрамкаў сучаснага жыцця. Дзякуючы ініцыятыве, рэалізаванай у Уздзенскім і Браслаўскім раёнах, у краіне пасляхова апрабаваны перадавы вопыт будаўніцтва і мантажу экалагічна бяспечных лакальных ачышчальных збудаванняў, а 9000 сельскіх жыхароў Мастоўскага раёна, уключаючы 735 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі атрымалі бесперабойны доступ да пітной вады.

У нашай краіне актыўна развіваецца экатурызм, а ў рамках праекту ў парку Горні Лідскага раёна акрыты першы ў Беларусі рэгіянальны лясны экалагічны адукацыйны цэнтр. Распрацаваны чатыры комплексныя турпакеты для заказнікаў “Азёры” і “Налібоцкі.” Створаны сайт www.itourist.by з базай экатурыстычных паслуг Беларусі. Адкрыты цэнтр міфалагічнага турызму, у аснове якога — унікальны і багаты свет беларускай міфалогіі.

У мэтах падтрымання біяразнастайнасці былі падрыхтаваны ўмовы для стварэння сістэмы збору дзікарослых ягад і грыбоў, а таксама комплексу па іх замарозцы ў заказніку “Налібоцкі”.

Атрымліваюць развіццё і іншыя экаідэі. Напрыклад, у Мар’інагорскай гімназіі быў адкрыты першы ў краіне “зялёны” дах. У Гомелі створана лінія па вытворчасці экалагічна бяспечнага антыфрызу.

Пасляхова рэалізаваўся праект “Гарсвятло: энергаэфектыўная мадэрнізацыя вулічнага асвятлення ў г. Полацку”. Іван Шчадранок, менеджэр праекту, кажа:

— Паказальная тэндэнцыя жыхароў некаторых еўрапейскіх гарадоў па адмове ад перамяшчэння на асабістым аўтатранспарце на карысць каршэрынгу (від карыстання аўтамабілем, калі адзін з бакоў не з’яўляецца яго ўласнікам; адмысловая мадэль пракату аўтамабіляў), грамадскага транспарту і ровару. Устойлівы гарадскі транспарт у “зялёным” горадзе працуе выключна па раскладзе і рухаецца па выдзеленай паласе. Гэта нашмат хутчэй. А яшчэ — больш экалагічна, таму што электробусы працуюць на электрычнасці і не забруджваюць шкоднымі выкідамі наваколле.

Не абышлі ўвагай удзельнікі праектаў і праблему адходаў. У Барысаўскім і Крупскім раёнах створана комплексная сістэма збору і перапрацоўкі адпрацаванага машыннага масла. У Хойніках створаны ўмовы для поўнай утылізацыі адходаў малочных прадпрыемстваў з дапамогай іх вывядзення з абароту і далейшай перапрацоўкі ў гатовы прадукт з высокім дабаўленым коштам.

Асаблівы гонар у аўтараў праектаў і ў жыхароў Беларусі выклікаюць поспехі ў арганічным земляробстве. Дзякуючы праекту, фермерскія гаспадаркі і сельгасвытворцы Смаргонскага, Ашмянскага, Валожынскага раёнаў пераходзяць на еўрапейскія стандарты. Плошчы, занятыя арганічнай сельскай гаспадаркай у гэтых раёнах, павялічыліся на 43 га.

У Чэрвеньскім раёне дзейнічае ўнікальная мабільная тэхналагічная ўстаноўка па вытворчасці аргана-мінеральных угнаенняў з даступнай у аграгаспадарках біямасы. У Смалявіцкім раёне створаны тры дэманстрацыйныя пляцоўкі па арганічным земляробстве з мэтай вырошчвання экалагічна бяспечнай прадукцыі для школьнага харчавання і папулярызацыі ўстойлівага землекарыстання сярод моладзі.

Удзел у “зялёных” праектах захапіў многіх беларусаў. Праектная дзейнасць, якая стымулюе эканоміку і спрыяе паляпшэнню экалагічнай сітуацыі ў краіне, пастаянна пашыраецца. Верагодна, такая актыўнасць звязана з тым, што большасць з нас неабыякава адносіцца да прыроды, імкнецца да развіцця і эканамічнай стабільнасці.

Вольга ПРАЛЮК

**Источник:** Родная прырода. – 2018. – № 11. – С. 20-21.